№ 20 Ausgabe B.

ГОМАН

Цэна с перэсылкай і дастаукай да хаты:
на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы—1 м. 20 ф., на 1 мес.—40 фэн.

Беларуская Віленская часопісь
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакціі: Вільня, Завальная 7.
Адрэс адміністрації і экспэдыціі:
М. Стэфанская 23.

Цэна абвестак:
на 4-ай старане за радок дробнымі літэрамі — 25 фэніг.; дробные абвесткі—па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці — 60 фэн. за лінейку дробн. друкам.

№ 20 (216). Год III. Вільня, 8 марца 1918 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.

ПЕЦЯРБУРГ (Рэўтэр). Вячорные газэты пацьверджаюць пастанову ураду, ня гледзячы на падпісаньне міра, далей перэвазіць дзержаўные установы ў Маскву, Ніжні Ноўгарад і ў Казань.

7 марца.

Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскага: Пры Діксмуйдэн узяты 3 бэльгійскіе афіцэры, 140 салдатаў і некалькі кулемётаў.

Фронт нямецкага Насьледніка: Пры Авокур мы уварваліся на францускіе пазыціі, зруйнавалі схоўкі ў акопах і вярнуліся з 27 палонымі.

У бітвах на паветры збіты 19 самалётаў і 2 прывязные лятучые шары.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 7.III. Сягоньня ў палудзень падпісана мірная умова між Нямеччынай і Фінляндзіей.

У артыкуле 1 гаворыцца, што стан вайны між Нямеччынай і Фінляндзіей больш не істнуе. Нямеччына паруліцца, каб усе дзержавы прызналі незалежнасць Фінляндзіі. Фінляндзія абязываецца—у прыпадку жаданьня уступіць часць сваей зямлі чужой дзержаве ці даць ей які-колечы сэрвітут—перш дайсьці угоды аб гэтым з Нямеччынай.

БЕРЛІН. У нэутральных газэтах ходзяць чуткі, бытцым урад «Саветаў» не зацьвердзіць мірнай умовы.

Сколькі вядома ў Бэрліне, трэба спадзевацца, што часць соцыал рэволюцыонераў і члены „Саветаў“, больш левые за цяперашні урад, ня хочуць прыстаць на мірную умову. Аднак Ленін хочэ зацьверджэньня, і з ім трэба лічыцца.

Пацьверджэньне мірнай умовы з Украінай гэтымі днямі будзе пададзено ў Бэрліне. Забаспечэньне карысьці гэтай умовы гэтак сама залежыць ад прыпадкаў, каторых наперод прарочыць нельга. Аднак нямецкае наступленьне забаспечыло прывоз папраўдзі вялізарных запасаў, якіе аказаліся на Украіне.

Румыніі будзе дадзен свабодны выхад у Чорнае морэ праз Констанцу. Гэта дасьць і нам магчымасьць зносін с Чорным морам і з усходам.

ВЕНА. (Корр. Б.) Апавешчэньне аб падпісаньні мірнай умовы з Румыніей вызвало як між народам, так і ў парлямэнці агульнае здаволеньне, як далейшы крок да агульнага міра.

СОФІЯ. Собраніе прыстало на прадоўжэньне паўнамочый парлямэнцкіх дэпутатаў. Новые выбары адбудуцца ў шасьцімесячным тэрміне пасьля дэмобілізаціі.

ЛОНДОН. Бонар Лёў у Ніжняй палаце іжадае крэдытаў на 11 мільярдаў марак на военные выдаткі да месяца чэрвеня.

ЛОНДОН. (Рэўтэр). З Вальпараізо наказываюць што з острава Пак прыбыло судно с 58 афіцэрамі і матросамі з нямецкага памочнага крэйсэра «Seeadler», каторые на караблі „Fortuna“ разбіліся ля острава Пак.

БЭРЛІН. **Урадова.** Нямецкіе падводные лодкі у паўночных водах ізноў затапілі 21.000 тонн.

БЭРЛІН. Спрычыны галандзкага данясеньня, бытцым між нямецкім і англіцкім поясам блокады знайшлі міны, ад якіх затанулі некалькі голандзкіх судзен, з асьведомленай крыніцы апавешчаюць, што гэные міны не пастаўлены немцамі.

ЛОНДОН (Рэўтэр) 5.III. Галава ірляндзкіх нацыоналістаў, Джон Рэдмонд, памёр у мінулую ноч. З розных мосц Ірляндзіі наказываюць аб разрухах сіннфэйнэраў.

НЬЮ-ІОРК (В.Т.Б.). На адбыўшыхся сягоньня дадатковых выбарах у ніжнюю палату у штаце Нью-Іорк першы раз галасавалі і кабеты.

РАЗВЯЗКА.

Мір з Расеей падпісан.

Гэтые словы нясуць урэшці супакой для мільёнаў на сьмерць змучэных людзей. Яны робяць канец страшэннаму праліцьцю крыві чэлавечай — прынамсі ў нас, на ўсходзі Эуропы.

Аднак, хіба ніхто ня думаў, што мір з Расеей будзе зроблен у такіх варунках і на такіх асновах як відаць с тэлеграфных вестак. І пэўне нікому ў галаву не прыходзіло, што для цэлага сьцягу спраў і палючых пытаньняў ён прынясе зусім несподзеваную развязку.

Такую развязку мір прынёс і для справы адносін між славянскімі народамі, а ў першы чарод — для пастаўленага некалі расейскім нацыональным паэтам, Пушкіным, пытаньня: „ці славянскіе ручьчы зыльюцца ў рускім моры? Ці высахне яно?“ Адказ на гэтае пытаньне дала сучасная вайна: нельга болей сумлевацца, што роль вялікарусаў, як «сабірацеляў славянства», пасьля аддзеленьня Украіны, вялікшай часьці Беларусі і Польшчы—скончэна.

З упадкам расейскай перевагі між славянамі звязана і другая справа, некалі вельмі непакоіўшая беларусаў і украінцаў: мір нанёс страшэнны ўдар усей польскай палітыцэ, аснованай на умове палякоў з маскалямі, каторую можна перэсказаць у некалькіх славах: «нема Русі,—ест тылько Москва і Польска» («німа Русі, а ёсць толькі Масква і Польшча»). Гэта значыло, што палякі, каб дайсьці згоды з маскалямі, умовіліся разам з імі працаваць дзеля нацыональнага знішчэньня беларусаў і украінцаў, с каторых часць павінна была абярнуцца ў маскалёў, часць—у палякоў. Польска-маскоўская умова была зроблена роўна дзесяць гадоў таму назад (—у 1908 гаду) перад усеславянскім з'ездам у Празе: перад гэтым з'ездам палякі умовіліся непрызнаваць беларусаў і украінцаў за асобные народы і лічыць, што яны разам з маскалямі становяць адно «русское» племя і што адзінымі прэдстаўнікамі апошняга павінны быць вялікарусы. Само сабой, беларусы і украінцы пры такіх варунках на з'езд у Празе не паехалі і праз украінскіх дэпутатаў у венскім парлямэнці заявілі перад усім сьветам свой пратэст проці польска-маскоўскай змовы.

Палякі крэпка дзержаліся гэтай умовы з маскалямі ажно да апошніх дзён, веручы, што вайна ў канцы канцоў давядзе да раздзелу Беларусі і Украіны між Масквой і Варшавай—дзеля аканчацельнай і поўнай дэнацыоналізаціі іх. Але расейская катастрофа перэвярнула ўсё ўверх нагамі: на палітычную арэну выступіла вялікая, багатая незалежная Украіна, вырваўшая нават с польскіх рук сваіх братоў-холмшчан, а на чародзі стаіць развязка беларускага пытаньня ў духу прызнаньня дзержаўна—нацыональных правоў за беларускім народам.

Развеяліся залатые сны палякоў аб «вялікай Польшчы», аснованай на паняволеньні «братніх» народаў...

Даўней ішла гутарка аб Польшчы сільнай, вялікай і здаволенай, з граніцамі ажно да Мінска; цяпер здаецца, што перэважыла концэпція Польшчы малой і слабой, саюз с каторай не мае вагі»...

Так пішэ «Dziennik Polski“ з 2 марца с. г., а на два дні перад тым — у № 58 тэй жэ газэты — польскі палітык М. Лэмпіцкі надрукаваў другое яркае прызнаньне неўдачы польскай палітыкі: ён б'ець „адбой» аннэксыйным плянам палякоў і прызывае да фэдэраціі Польшчы, Літвы і Беларусі...

Агледаючыся цяпер на дзесяць гадоў непрымірымай барацьбы палякоў з усімі праявамі беларускага нацыональнага адраджэньня, нельга устрымацца ад слоў здзіўленьня с прычыны поўнай непалітычнасьці палякоў і нядольнасьці іх да шырэйшых палітычных концэпцій, да заглядываньня ў больш далёкую будучыну. Так, што польскіе палітыкі лічылі дужым і вечна трывалым, аказалося волатам на гліняных нагах. Наадварот, у народных рухах беларусаў і украінцаў да будаваньня свайго незалежнага нацыональнага быту палякі не дагледзілі тэй магутнай жывой сілы, якая захована ў народных массах.

Запраўды, правільна ацэніваў сваё грамадзянство вядомы польскі публіцыст, Людвік Страшэвіч, каторы гадоў восем таму назад пісаў у варшаўскім «Слове»:

«Мы, палякі,—самы непалітычны народ пад сонцэм!»

І. Мелешка.

Экономічнае палажэньне Беларусі у зьвязі з яе палітычнай орыэнтаціей.

Усімі цяпер прызнано, што адну з глаўных прычын, прымушаючых той ці іншы народ да палітычных саюзаў (уніі, фэдэраціі, трактаты) з другімі народамі ці дзержавамі, становяць яго экономічные патрэбы. Значыць, ад апошніх і залежыць палітычная орыэнтація народу ці краю. Вось-жэ разгледзім экономічнае палажэньне і варункі Беларус-

кай зямлі, каб з гэтага снавацъ думкі аб яе палітычным кірунку.

Беларусь, абнімаючы абшары губэрній Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Вітэбскай і часьці іншых, залегла ў бассэнах рэк Нёмана, Дзьвіны і Днепра. Гэтак заходняя і паўночная часць Беларусі цягнецца бязспорна да выхаду ў Балтыцкае мора Нёмана і Дзьвіны, па каторых найлягчэй вывазіць вытвары краёвай гаспадаркі. Побач с тым вязуць краёвые тавары да Балтыцкага мора дзеля збыту заграніцу тутэйшые чыгункі: Лібаўска-Роменская, Рыжска Арлоўская Віндаўская. Ды што-ж вывозіць Беларусь?—Беларусь гэта край глаўным чынам сельска-гаспадарскі: без мала ўсё, што яна высылае ў другіе краі, гэта — плады зямлі. Невялікае число краёвых фабрык гэтак сама занімаецца перэработкай сельска-гаспарскіх прадуктаў (бравары — бульбу і жыта, гарбарні — мейсцовые скуры і т. д.). А прадукты гэтые — ўселякае збожжэ (жыта, пшаніца, авёс, ячмень, грэчка), лён, бульба; далей — лес і лясные матэр'ялы, каторые занімаюць першае мейсцо ў нашым вывазе заграніцу урэшці — рагатая скаціна, сьвіньні, гавечкі, птацтва — жывое і як мяса, малочные прадукты, коні — вось усё, што становіць аснову жыцьця нашых жыхароў, каторые часьцю спажыткоўваюць іх самі, а рэшту прадаюць у другіе краі, каб здабыць так сама патрэбную гатоўку.

Беларускі край пад расейскім панаваньнем сто з лішкам гадоў жыў у вельмі благіх экономічных варунках, не даваўшых яму, як сьлед, развівацца. Сельская гаспадарка у селян і у дробных і сярэдніх землеўласьнікаў асталася і дагэтуль на вельмі нізкай ступені развіцьца, с первабыўнымі спосабамі выработкі зямлі (як трохпалёўка і т. п.), і толькі паны вялікшых абшараў, прадаючы лясы, мелі магчымасць за атрыманые гэтак грошы падняць свае гаспадаркі да вышэйшай культуры. Ня дзіва, што пры такім палажэньні Беларусь мела на прадажу сельскіе прадукты толькі ў невялікай меры. Урадлівасць зямлі была невысокая, — у іншые гады край наш ня толькі ня меў лішкі на прадажу, але сам быў прымушэн прыкупляць збожжэ, каб пакарміцца, хоць у нас гэтулькі ральлі, гэтулькі пожней і пашы паддастаткам.

Як жэ гэта сталося? чаму сельска-гаспадарская культура аказалася ў нас гэткая нізкая і не магла развінуцца так, каб пракарміць наш народ і даць яму лішак — гатоўку?

А вось чаму. Дзеля падняцьця сельска-гаспадарскай культуры патрэбны: 1. капітал, каторага нашы землеробы ня мелі, а крэдыт быў недаступны і лішне дарагі; 2. тэхнічная і сельска-гаспадарская навука, аб каторую расейскі урад зусім не рупіўся; 3. добрые дарогі, каторые расейскі урад — с прычыны блізкасьці граніцы — сьвядома і з яснай мэтай пакідаў у благім стане; 4. глаўным чынам — тое, каб можна было лёгка і с карысьцю працаваць плады працы на ральлі, — значыць, па гакіх цэнах, каторые аплачывалі бы і працу, і зробленые затраты грашмі, дый давалі-бы зыск у постаці гатоўкі.

Глаўны с-паміж гэтых варункаў — чацьвёрты — быў для Беларусі у часе палітычнай еднасьці з Расеей зусім немагчымы. Цэны на збожжэ, скаціну, каней і т. д. павінны былі ў нас быць заўсёды нізкіе, бо мы ніколі не маглі выдзержываць конкурэнціі з Расейскай дзержавай, каторая ўсе гэтые прадукты вытварае ў вялізарнай меры і са шмат меншым коштам. На нязмераных абшарах Расеі вельмі многа орнай зямлі, урадлівасць каторай шмат вышэйшая, чым у нас. Побач з гэтым і клімат там мейсцамі лепшы дзеля гаспадаркі, чым у нас, і танных рабочых рук паддастаткам, бо жыцьцё тамака таней, чымсі ў нас. Ня дзіва, што Расея ня толькі не была пакупцом на плады нашай зямліцы, а была нашым конкурэнтам — і то вельмі сур'ёным. Калі, бывало, цэны на збожжэ і скаціну ў нас пачыналі ісьці ў гару, дык ураз-жэ наплывало да нас расейскае збожжэ і скаціна, і цэны ізноў падалі. Даходзіло да такіх дзіўных прыпадкаў, што, напрыклад, тутэйшые бравары гнаўшые спірт з жыта, куплялі гэнае жыта не на тутэйшых торжышчах, а выпісывалі з глыбіні Расеі, ці нават с Сібіру. І тут у аснове ляжала палітыка расейскага ураду: дзеля падтрыманьня дабрабыту цэнтральных губэрній, расейскі урад устанаўліваў гэткіе цэны за правоз чыгункай збожжа, што, чым з найдалейшых расейскіх губэрній трэба было вязьці яго тым таней брэлі с пуда за вярсту, і нават пры найвялікшай адлеглясьці расейскае збожжэ можна было прадаваць таней за нашэ.

Гэтак Расея сваім танным збожжэм забівала нашу сельскую гаспадарку, падкапываючы самую аснову нашага дабрабыту. Праўда, Беларусь мела пад бокам нямецкую граніцу, мела лёгкі доступ да портаў Балтыцкага мора і гэтак магла прадаваць свае прадукты заграніцу. Але і тут сягала расейская конкурэнція: таннае расейскае збожжэ, скаціна і т. д. карысталіся дыфэрэнцыяльнымі тарыфамі і железнадарожнымі льготамі ў роўнай меры і тады, як ішлі заграніцу. І беларусы былі прымушэны аддаваць і тут сваё дабро па тэй цане, па якой прадавалі збожжэ с цэнтральных губэрній, хаця мы ад гэтага мелі очывістую страту, або ў найлепшым здарэньні прадавалі свае прадукты без ніякага выску.

На і без таго нізкіх цэнах на шага збожжа пры такіх варунках вельмі некарысна адбіўся таксжэ тарговы трактат між Расеей і Нямеччынай с 1904 году: ён яшчэ больш панізіў цэны сельскіх прадуктаў.

Вось, усе гэтые прычыны і зрабілі тое, што беларускі хлебароб — чы дробны, чы вялікшы — ніколі ня меў гатоўкі і гэтак ня мог нават думаць аб тым, каб сваю гаспадарку падняць на вышэйшую культурную ступень, пры каторай купляючы штучные гнаі, ужываючы лепшые машыны, устраіваючы на палёх дрэны і т. д., узраслабы і урадлівасць зямлі. Вытварылося запраўды зачарованае кола: танные цэны за сельска-гаспадарскіе прадукты не давалі магчымасьці атрымліваць з гаспадаркі чысты выск, гатоўку, — а недастача грошы не давала падняць гаспадарку на вышэйшую ступень. І Беларускі гаспар вырабляў мала прадуктаў, дый мала і танна прадаваў плады сваей працы.

Рэзультатам гэтага было тое, што сельская гаспадарка наагул (дробная, сярэдняя, вялікая) не падымалася, а паніжалася, вёска бяднела, а разам з ей стаяў на мёртвым пункце і ўвесь край — глаўным чынам сельска-гаспадаскі. У апошніх гадох мы бачылі, як землеўласьнікі ўсё часьцей банкроціліся, а іх зямлю прадавалі з ліцытаціі, або браў сялянскі банк, каторы, праводзячы свае палітычные (абрусіцельные) мэты, распрадаваў яе часткамі не тутэйшым малазямельным хлебаробам, а людзям прышлым, чужынцам — вялікарусам. Дробные гаспадаркі, не маючы магчымасьці пашыраць свае межы ў патрэбнай меры, так сама марнелі, і, ня гледзячы на стаўляные расейскім урадам прашкоды, ўсё больш народу з вёскі выежджало у Амэрыку, ды гэтак убывалі ў нас сотні тысяч здаровых, здольных да працы рабочых рук.

З усяго вышэй сказанага бачым што Беларусі пад панаваньнем Расейскай дзержавы з экономічнага пагляду жылося вельмі блага. Само сабой разумецца, што пры такім палажэньне не магло быць гутаркі і аб прамышленым, тарговым, культурным і палітычным развіцьці нашага краю. — Вось-жэ цяпер, калі с прычыны ваенных прыпадкаў узнімаецца пытаньне, чы для Беларусі з экономічнага пагляду была-бы карысць вярнуцца пад Расею, дык трэба даць ясны і цьвёрды адказ: не! Чы то у форме уніі, чы фэдэраціі, чы мытнага (тамажэннага) саюза, — еднасць Беларусі з Расеей зрабіла-бы, тое, што наш край ня мог бы развівацца экономічна і заўсёды аставаўся бы на ніжэйшай ступені сельска гаспадарскай культуры і агульнага развіцьця. А с прычыны таго, што, як мы на пачатку сказалі, ад экономічных патрэб кожнага краю залежыць і яго палітычная орыэнтація, — Беларусь павінна адкінуць уселякую орыэнтацію ў бок Расеі, калі хочэ жыць і развівацца ў будучыне.

І. Батура.

Усходняя Эўропа.

Прафэсар Ястроу у «Deutsche Politik» пішэ:

«Ужо с пачатку гэтае вайны мы мусілі недзержаўные народы ўсходняй Эўропы лічыць сваімі прыроднымі саюзьнікамі. З усяе лічбы 130 мільёнаў жыхараў Расеі прыходзіцца на Фінляндзію 3,1 мільёну, на Прыбалтыцкіе губэрні (з мешанымі жыхарамі: немцамі, эстонцамі, латышамі і швэдамі) 2,4; на Польшчу (каторай жыхары палякі—адзіные славяне, што зусім працівяцца панславізму, 9,4; на Бессарабію, каторую Расея адабрала ад румын 1878 г. дыпляматычным гвалтам, 1,9 мільёнаў. Ня лічучы зусім чужых народаў, як напр. мардвіноў (ля Волгі, татароў, башкіроў, кожнага з гэтых народаў ёсць 1—1½ міл.), па абодвых бярагох Днепру аселі украінцы, каторых ёсць 23,8 мільёнаў, іх хоць звалі «маларусамі», аднак дзеля гэтага яны не расейцы; ня чужы гэта народ расейцам ды свой паўднёвым славянам (п. прафэсар забываецца яшчэ аб зусім самабытным Беларускім народзе, каторага налічаецца 12 мільёнаў—прып. *Рэд.*).

Цяпер увесь сьвет падзелены на дзержавы. Толькі тые народы, каторые аселі між Нямеччынай і Кітаем, не маглі утварыць асобных дзержаў, бо тут гэтаму перашкаджала вялізарная расейская імперыя. Было б вельмі наіўным думаць каб гэткае палажэньне асталося вечна; с палітычнага пагляду гэтага сур'ёзна прымаць ня можна. Мы ляпей павінны задаць сабе пытаньне: «Ці тое, што цяпер перажываем, ёсць першым пачаткам распаду імпэрыі?»

Ня думаю, каб цяпер у Нямеччыне знайшоўся яшчэ чэлавек, каторы не пазнаў бы распаду. Аднак з гэтага ня трэба рабіць вывадаў аб рэзультаце расейскай рэвалюціі. Гісторыя ўсіх рэвалюцый вучыць, што за радыкалізмам ідзе реакція. Ці проці бальшэвікоў ня выступіць яшчэ Керенскі, ці проці яго яшчэ раз ня выступіць Мілюков і яго кадэты, гэтага цяпер ніхто ня можэ ведаць; таксама посьмела было б гаварыць,

Максім Гарэцкі.

АНТОН.

(Абразы жыцьця).

(Гл. «Гоман» № 19).

ДОМНА. Пушчу, пушчу, каб прастудзіліся. Чуіш вун Іваньку старцы узяць хочуць,—і цябе у хатыль забяруць.

ХОДАЧКА. А я уцяку ад іх. Мама, а гдзе йта пчолкі, а? Пахаваліся, а? А зроб мне новую лялькy, мама, а?

ДОМНА. А сьціхні ж ты,назолачка... Слухай во, я табе песьню сьпяю, ну слухай (пачынае паціхеньку, нахіліўшыся пад шыцьцём, пець Ходзі. Іванька зарумзаны стаіць ля маткі і стругаіць кіёчык. Домна тоненька, як нітку выводзіць, пяець)

Дарогаю ды шырокаю, дуброваю ды зялёнаю
Туды б ішла ды сіротачка, туды б ішла ды маленькая

(У пярэрвах яна гаворыць с Ходай; за сталом сваім чынам).

СТАРЭЦ 1-шы. (бас, сьляпы) Ен можэ даць раду ад усякае хваробы, ад усякага паддаваньня, усё што патрэбна...

СТАРЭЦ 2-гі. (тэнар, троху відушчы) Гэта ж ён летась памог нашаму Яхіму узяць за сябе Прэску. Гэ-гэ-гэ... Абодвы цяпер у кучы добранька зьбіраюць. У-зімку на кані ажно пяць мяхоў жыта нажабравалі, а які другі старэц тое выхадзіць?

СТАРЭЦ 1-шы. Ужо і насьледніка маюць... Ай насьледніцу?

СТАРЭЦ 2-гі. Насьледніка, гэ-гэ-гэ... Маюць, а як жэ. Зарадзіўся ладны старчык: па матцы сухарукі, па бацьку — бяз воч. Яхім рад. Ато, брат, задумаў ён жаніцца: Прэска а ні блізка!—«Што ён,—гаворыць,—сьлепанджа, што з ім выхадзіш? Я прыгожа, а са сваімі сухімі рукамі я за лепшага ў губэрні старца зайду». Яна, чуіш, мэцілася за аднарукага Аўласа, ён хлапец гладкі, а на кірмашох сухую руку як выставіць ды псалму як зацягніць, дык грошы так яму і сыплюцца. От яна за яго і кіравалася, гэ-гэ-гэ..

СТАРЭЦ 1-шы. А дзед Янка як даў раду—стропаная пайшла. Ян, брат, гэты Янка, усе чыста можыць..

АУТУХ. А на стрэльбу загавора ня ведаіць...

СТАРЦЫ 1-шы і 2-гі. Ня ведаіць? Ха-ха-ха! Гэ-гэ-гэ!.. Так (шэпчыць 1-шы) заклянець—без а ніводнага промаху, ластаўку на ляту! Ен жэ падаў пану Ступяркоўскаму, бо той не пусьціў яго у хату на нач; сохніць цяпер пан Ступяркоўскі... О!

АНТОН. (хмарнеючы) Грэх вялікі! Вялікі грэх! Усё чэлавеку просьціцца, а чараваньня—ніколі... Не вадзіся з *імі*, Божымі ўрагамі. Прадаўся ім—канец. Вялікі грэх, дзядзькі!

АУТУХ. Ці чуў? Спасеннік запеў. А як бацьку выратаваць ад дурнога сабакі таксама грэх можэ?

АНТОН. (утупіўся) Богу відна, гдзе грэх.

што Расея ўжо ніколі ня будзе мець цара. Усе гэтые пытаньня не чапаюць прынцыпіяльнага пункту усходня-эўропейскай справы. Гэты прынцыпіяльны пункт, гэты карэнь, гэта—самае паняцьце «Расея». Гэта паняцьце ўжо закалыталася і прызнана, што ўводзіць у абмылку і мусіць быць знойдзены другі назоў на яго месцо.

Я думаю, што пазнаваньне гэтае справы ў Нямеччыне стала б ясьнейшым, каб мы прывыклі ў адносіньні да гэтых абшараў ужываць замест назову «Расея» слова «Усходняя Эўропа». Усходняя Эўропа цяпер перад падобным пераваротам, якога дазнала Заходняя Эўропа паўтары тысячы гадоў таму назад. Як тады падчас распаду заходня-рымскай імпэрыі маладые германскіе народы стараліся утварыць свае асновы, так і цяпер гэта робюць славянскіе і неславянскіе народы, што аселі на зямлі ўсходняе імпэрыі. А дзеля таго, што тады працэс гэны цягнуўся цэлые сталецьця, дык нячутым было б жадаць ад людзей ураду, працуючых над канчэньнем вайны, каб яны адным махам утварылі цьвярдое, трывалае палажэньне. Усё, што можна дапяць у гэту вайну і праз мір, гэта: утварыць такое палажэньне, каторае зробіло б магчым усім народам іх далейшае разьвіцьцё.

Інтэрэс, які мае ў гэтым Нямеччына, ёсць у сваей істоце інтэрэсам абазпечэньня міру. Усходняя Эўропа, кіраваная маскоўцамі, прэдстаўляла на граніцы з Заходняй Эўропай цэлы суцэльны ланцуг чужых нацыянальнасьцяў, «інародцаў». С поўначы на паўдня: Ляпляндыя, Фінляндыя, Прыбалтыйскіе губэрні (Эстонія, Ліфляндыя, Курляндыя), Польшча, Літва, Украіна, Бессарабія), далей на паўдзенна-ўсход каўказкіе народы. З гэтае прычыны пануючы маскоўскі народ адносіўся да вайны начэй, чымся кожны іншы народ, бо кожны іншы народ ведае: калі будзе ісьці ўпярод, тады пераняся вайну на непрыяцельскую зямлю; калі будзе пабітым, дык яго край стане полем вайны. Прагавіты ўласьці маскоўскі народ праектаваў з усім супакоем, што калі ён паб'е, то пацерпіць непрыяцельскі край, а калі яго паб'юць, то пацерпяць краі „інародцаў». Усходніе Прусы і Галіччына шмат пацярпелі с прычыны, наступаньня расейскага войска. Затое калі расейцы пабітые ля Таннэнбэргу і Горліц уцекалі назад, тады не пацярпеў маскоўскі край, але вайна ішла далей на землях «інародцаў».

Як мы, так і «інародцы» заінтэрэсаваны ў тым, каб гэтые адносіны зьмяніліся. Але таксама ў гэтым заінтэрэсаваны і большэвікі, бо яны ня хочуць, каб пасьля гэтае вайны утварылася дзержава, могучая весьці новые войны с тэй пэўнасьцю, што край і народ яе будуць карыстаць с пабед, але ня будуць мець шкоды с пабіцьцяў.

Цяпер ёсць некаторые прычыны, каб адзначыць гэткае палажэньне. Праўда не ў Нямеччыне, але ў яе сталіцы ад некаторага часу ёсць настрой, адзначаючы, быццам для Нямеччыны карысна дужая Расея (дзеля Англіі); адзначаецца гэта с такім націскам, што, хто ведае, ці ня прыдзецца калісь шкадавацца. Наймажнейшым органам гэтага настрою ёсць «Vossische Zeitung». Ня гледзючы на ход часу і здарэньняў гэта газэта асталася яшчэ для шырокага грамадзянства «Бэрлінскай газэтай», ды нават павялічыла свой уплыў с таго часу, як вельмі сьвядома і з мэтай напісаные панядзелковые стацьці Бэрнгарда прывучылі чытачоў сачыць за заграніічнай палітыкай. Бернгард цягам прыпамінае сваім чытачом аб тым, што міручыся ня можна думаць толькі аб бальшэвіках, каторые падпішуць мірную ўмову. Палітыка павінна утварыць такі мір, каб у будучыне ніводзін расейскі ўрад ня меў прычыны да вайны з Нямеччынай і гэтым не памог пабедзе Англіі. Да гэтае мэты вядзе толькі адна палітыка: злучэньне кантынэнту і гэтым самым палажыцца канец усякаму мешаньні англа-саксаў. Ня можна пярэчыць, што гэта палітыка мае думку, каторая заслужывае, каб яе заўсёды паўтараць. Дзеля гэтай думкі і мы жадаем сабе дужой Расеі. Але мы жадаем сабе дужой Расеі там, гдзе яна можа быць небасьпечнай для Англіі: ля Індыі. А гэтаму перашкаджае палітыка, каторая далёка ад памаганьня утвареньню дзержаў у Усходняў Эўропе, мусіць весьці да таго, каб ажывіць ізноў масквалізм ля Балтыцкага і Чорнага мора.

Чаму дзесяткі гадоў перад вайной мы не бачылі, як належыць, развіцьця Усходняй Эуропы? Таму, што кіравалі гасударствам людзі, каторых фантазія не ішла так далёка, каб яны, маглі прэдставіць нашу плянэту без амбасадора ў Пецярбурзе. Дзеля гэтага ж у нас вырабілося фальшывае паняцьце аб рэальнай палітыцэ, каторая думае, што лічыцца «з рэальнымі фактамі», калі «разглядае справы гэткімі, якімі яны ёсць». Калі ў Усходня - Эўропэйскім пытаньні ёсць што пэўнае, дык гэта тое, што машына, перашкаджаючая утварэньню гасударстваў, каторая завецца расейскім гасударствам, вечна трываць не будзе. Гэта пэўна дзеля таго, што нічога на гэтым сьвеце вечна не трывае. Гэнай палітыцэ, можэм закінуць, што яна думае аб заўтрым, але не аб пазаўтрым. Яна думае аб фактах, што па чародзе зьменяюцца ў панаваньні ў Эўропе, але прапушчае (ўводжэна ў абмылку назовам «Расея»), што ўжо прыходзіць час, калі народы пачнуць тварыць свае праўдзівые дзержавы.

У Вільні і ваколіцах.

× **Падпіска на новую ваенную пазыку** пачынаецца 18 марца і канчаецца 18 красавіка. Варункі — тые самые, як і пры ранейшых ваенных пазыках.

× **У мястовым лёмбардзі** (Троцкая 14) 20 і 21 марца адбудзецца публічная прадажа заложэных рэчэй, тэрмін выкупу для каторых мінуў 30 лістапада 1917 г.

× **Неўдачны банкет.** У кватэры Богушэўскіх (Бакшта 3) сабраліся сваякі. Дасталі знекуль дэнатураванага спірту. Пачалі піць ды весяліцца.

Вясельле гэнае аднак трывало нядоўга. Атрута хутка зрабіла сваё дзела. Вызвалі карэтку скорай помачы. Гаспадыня хаты — 70 гад. старуха, Марыя Богушэўская, была ўжо нежывая. Яе зяць, Стэфанія Алексо (24 г.) і Стэфанія Романоўская (20 г) былі сільна атручэны. Іх усіх адвялі ў бальніцу Савіч.

Надзея на выздараўленьне вельмі слабая.

× **Чародные кражы.** У аднэй краме на сьв Юрскім праспэкці ў начы на 3 марца украдзено сукна розных колераў, бялізны, рукавіц і т. п. на сумму разам 14.000 м.

У аднэй краме на Домініканскай вул. ў начы на 4 марца украдзено цыгар, папірос, масла, сыру, сьвеч на 3,500 марак.

× **Тэмпература.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпература за апошніе дні была (па Цэльсію):

	найвыш.	найніж.
4—5	+ 6,3°	— 2,5°
5—6	+ 4,4°	— 8,5°
6—7	+ 3,6°	—10,5°

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

ШТОКГОЛЬМ (В.Т.Б.) **Ніжняя палата.** Міністар-прэзыдэнт заявіў, што аружнага выступленьня Швэцыі у справе Аляндзкіх астравоў не будзе.

Прадстаўнік правай партыі жаліўся на палітыку Швэцыі, выкаваўшую заяву Фінляндыі: «Швэція нас прадала!»

Левы социаліст Мансон зажадаў, каб урад ураз-жа забраў свае войска з Аляндзкіх астравоў.

ХРЫСТЫАНІЯ. Газэты, прыхільные саюзьнікам, стараюць выставіць нямецкіе опэрацыі на Аляндзкіх астравох, як варожые да Швэцыі.

Расея і цэнтральные дзержавы.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 4.III. **Главная Камісія Рэйхстагу.** Памочнік статс-сэкрэтаря да заграніічных спраў, барон ф. Бушэ, заявіў, што ў найбліжэйшых днях будзе падпісана мірная умова с Фінляндзіей. «С прычыны таго, што і Румынія прыстала на нямецкіе варункі, — мы стаім на парозі агульнага міра на усходнім фронці. Швэцыя пасьля кароткіх перэгавораў прыстала на дачасное заняцьце Аляндзкіх астравоў нямецкім войскам.

БРЭСТ-ЛІТОУСК. 3.III (канец умовы аб міры).

Артыкул 5.

Расея ўраз жэ закончыць поўную дэмобілізацію сваей арміі, абнімаючы і войскі, організованые рэволюцыйным урадам. Расея ўвесь свой флот адвядзе ў порты свае, дзе ён будзе аставацца да агульнага міра.

Артыкул 6.

Расея абязываецца ўраз жэ падпісаць мір з Украінай і прызнаць мірную умову між Украінай і цэнтральнымі дзержавамі. Украінскіе землі будуць ураз жэ ачышчэны ад расейскіх войск і ад чырвонай гвардзіі. Расея спыняе ўселякую агітацію проці тымчасовага украінскага ураду і проці іншых украінскіх організацый.

Эстляндзія і Ліфляндзія гэтак сама неадкладаючы ачышчаюцца ад расейскіх войск і чырвонай гвардзіі. Наагул, усходняй граніцай Эстляндзіі будзе рэка Нарова, а усходняя граніца Ліфляндзіі йдзе праз вазёры Пейпус і Псковское — да палудзенна-заходняга кута апошняга, пасьля цераз возера Любань на Лівэнгоф. Эстляндзія і Ліфляндзія будуць заняты нямецкай паліцэйскай сілай—датуль, пакуль там краёвымі установамі ня будзе установлен дзержаўны лад. Расея ўраз жэ выпусьціць на волю ўсіх арэштаваных або высланых жыхароў Ліфляндзіі і Эстляндзіі і забэспечывае ім паварот. Фінляндзія і Аляндзкіе астравы гэтак сама ачышчаюцца ад расейскіх войск і чырвонай гвардзіі, а фінляндзкіе порты—ад расейскага флоту. Расея абязываецца спыніць у Фінляндзіі ўселякую агітацію. Форты на Аляндзкіх астравох магчыма скора будуць зніштожэны. Аб будучыне Аляндзкіх астравоў будзе сказано ў асобнай умове між Нямеччынай, Расеей, Фінляндзіей і Швэціей.

СТАРЭЦ 1-шы. Э, братка мой! Грэх у мех, а спасеньня наверх.

СТАРЭЦ 2-гі. Альбо ў торбу ды аб вугол.

СТАРЭЦ 1-шы. Цяпер толькі мы, простые людзі, баімся грэху. Паны, брат, ды й з нашых разумнейшые грэху ўжо не баяцца. Дзеля таго, што яны цяпер так дайшлі, братка: Хрыстос хадзіў па вадзе—і я пайду ўа вадзе, Хрыстос..

СТАРЭЦ 2-гі (перабіваючы). ...Хрыстос летаў—і я палячу. Дык каго ім баяцца? Німа каго баяцца, дык што за грэх будзе, калі німа каго баяцца. Ен не баіцца, што яму грэх! Грэх... гэ-гэ-гэ...

СТАРЭЦ 1-шы. Хрыстос рабіў сьляпых відушчымі, а заграніцке дактары па навукам дайшлі: сабаччае вока чалавеку уставіць, і чалавек бачыць усё—чысьценька, дай Бог усякаму добраму.

СТАРЭЦ 2-гі. Чаму не? Га-гэ-гэ...

АНТОН. (вытрэшчыў вочы) Як жа гэта яны? Ці ж так?

СТАРЭЦ 1-шы. А што чараўнікі чаруюць, дык на то ім сіла даецца. Бяз гэтай сілы і людзям пражыць было б трудна. Скажым чэлавек занядужаў, карова захварэла, вужака укусіла, ці сібірская муха джыгнула—хто раду, братка, дасць? Дзед Янка, болі ніхто, бяз дзеда ня можна, ён сілу маіць, яму дзяды перэказалі.

СТАРЭЦ 2-гі. Поп казаў: «Грэх». А як пачала здыхаць цёлка, скотны доктар не даў помачы, дык і бацюшка хлапца па Янку на кані прысылаў. І карова цэла! Гэ-гэ-гэ...

СТАРЦЫ 1-шы і 2-гі. І карова цэла!

АНТОН. А ўсё-ж-ткі грэх, калі ён у загаворах да іх моліцца, грэх... Німа грэху, калі Бог памінаецца, сьвятые, Цар Давід.. А так—то грэх.

АУТУХ. Ат! Што мы ведаім...

СТАРЭЦ 1-шы (п'ець з Аўтухом). Грэх, можа ня грэх, а спрадведжу так павадзіцца... (глядзіць у вакно) А дождзжык як закупрыў, як запыліў, дык і курыць і курыць...

АУТУХ. У пані сена коп на сто гніець.

СТАРЭЦ 2-гі. Коп на сто! Добра табе, панічка! Гэ-гэ-гэ...

СТАРЭЦ 1-шы. А ты думай...

АНТОН. Бог як захочыць: альбо высушыць, альбо намочыць. (і ён асьцярожненька, есць старэцкае сала с хлебам).

АУТУХ. Ну вып'ім яшчэ па аднэй, ці што (п'юць; Антон атходзіць, каб ня піць).

ДОМНА. (дадумалася) У каго людзічкі рупяцца, працуюць; дождж — лапці хаця плятуць, грабелі ладзюць, косы клепаюць вяроўкі віюць, ці што. А нашым мужчынам нічога ня трэба. Ці хто йдзець ці хто едзіць—грым! к Аўтуховым ды за гарэлку. Антон! Ну ты ж ба хаця хамуціну тую направіў...

АУТУХ. А маўчы! Бабскі розум... Бярэшся не за сваё.

СТАРЭЦ 1-шы. А ні чэпай ты яе, ведама раставацца с сынам усякай матцы тошна. На тое ж матка. А ты, Іванька, рыхтуйся.

(Далей будзе).

Артыкул 7.

Прызваваючы Пэрсію і Афганістаністан за вольные і незалежные дзержавы, умаўляючыеся староны абязываюцца шанаваць іх палітычную, экономічную і тэрыторыальную нетыкальнасць.

Артыкул 8.

Ваенна-палонные абедзьвых старон будуць пушчэны дамоў.

Артыкул 9.

Умаўляючыеся староны адмаўляюцца ад звароту ваенных выдаткаў і шкод, зробленых ім і іх падданым на опэрацыйных абшарах ваеннымі крокамі, лічучы ў тым і рэквізыції.

Артыкул 10.

Дыплёматычные і консульскіе зносіны будуць вернены ўраз же пасьля зацьверджэньня мірнай умовы.

Артыкул 11.

Дзеля экономічных зносін мае вагу зробленая перад вайной умова згодне з далучэнымі дакумэнтамі.

Артыкул 14.

Гэта мірная умова павінна быць зацверджэна. Пры гэтым расейскі урад абязываецца зрабіць гэта на жаданьне не пазней, як у два тыдні. Мірная умова мае сілу ўраз жэ пасьля зацьверджэньня яе.

Брэст-Літоўск. 3 марца 1918 г.
(Подпісы).

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 4.III. «Nord. Allgem. Ztg.» пішэ:

«З расейскага боку кажуць, што расейскіе дэлегаты былі прымушэны падпісаць мірную умову, не пазнаёміўшыся з ей падробна. Гэта зусім нязгодліво с праўдай. Пасьля аднаўленьня перэгавораў палітычные пункты цяперашняй умовы падробна разбіраліся расейскімі дэлегатамі і нашым паслом ф. Розэнбэрг'ам. А ад утварэньня асобных камиссій дзеля разгляду расейцы самі адмовіліся. Значыць, яны падпісалі умову пасьля знаёмства з ей, каторае самі прызналі за дастатачнае».

БЭРЛІН. У дадатку да арт. 11 і 12 мірнай умовы устанаўліваюцца падробнасьці аб замене ваенна-палонных. Спосаб і час замены будуць устаноўлены мешанай камісіей.

ПЕЦЯУРБРГ (Рэўтэр). Глаўны спаўніцельны камітэт апублікаваў заяву, апавешчаючы, што падпісаная мірная умова павінна быць пацьверджэна ў 14 дзён. С прычыны таго, што некаторые рады стаяць за мір за ўселякую цану, а іншые гатовы ужыць крайніх способаў у барацьбе з нямецкім імпэрыялізмам, канечне трэба сазваць экстрэны з'езд рад, каторы мае развязаць гэтае пытаньне. З'езд павінен адбыцца 12 марца ў Маскве.

ПЕЦЯРБУРГ. Рэгулярные расейскіе войскі па прыказу Крыленка будуць выведзены з Украіны і Фінляндзіі ў 8 дзён.

РЫМ. У дыплёматычных кругах апаведаюць, што заходніе дзержавы ў дзень зацьверджэньня мірнай умовы большэвікамі аб'явяць блокаду ўсяе Расеі.

БРЭСТ-ЛІТОУСК (В.Т.Б.). 4.III. Перад падпісаньнем мірнай умовы галава расейскай дэлегацыі, Сокольнікоў, зрабіў гэткую заяву:

«Варунак умовы аб адрачэньні Расеі ад каўкаскіх акругоў Ардагана, Карса і Батума становіць уступку зямлі без згоды жыхароў, і з гэтай прычыны Расея прыніімае іх толькі с пратэстам. Нямецкі ультіматум захапіў Расейскую рэспубліку пры дэмобілізацыі, і з гэтай прычыны Расея прымушэна прыняць ультіматум і падпісаць пададзеную ей умову. Гэты мір— не мір, асновааны на угодзі. Акраінные народы Расеі пад прыкрыцьцем права на самаазначэньне падпадаюць пад варожую руку, каб абараніць ад рэволюціі пануючые там класы і узмацаваць сілу контррэволюціі. У Фінляндзіі і Украіне цэнтральные дзержавы гэтак сама паддзержываюць варожые да рэволюціі кірункі. Згвалтаваная разрывам замірэньня, Расея падпісывае мірную умову, дарэмна звертаўшыся да нямецкіх работнікаў. Перэгавораў аб мірнай умове яна не вядзе».

Пасол Розэнбэрг адказаў, што да міра Расеі не прымушаюць. Ад вольнай волі расейскага народу залежыць прыняць мірные варункі, ці ваеваць далей. Расейскі урад не мае права сумлевацца аб плянах Нямеччыны у адносінах да насяленьня акраін.

Пасьля новай прамовы Сокольнікова, паўтарыўшага, наагул сваю першую заяву, а 4 гадз. паабедзі пачалося падпісываньне умовы.

Японія і Расея.

ТОКІО. Мотоно і адмірал Погопато адбылі нараду з Мікадо аб прыпадках у Расеі. Выезд дыплёматаў саюзьнікаў с Пецярбурга Японія лічыць за разрыў дыплёматычных зносін з Расеей.

ПАРЫЖ. «Echo de Paris» пішэ:

«Заняцьце сібірскіх зямель Японіей абмінуць нельга»

«Action Francaise» пішэ:

«Саюзьнікі не павінны абразываць японскіх дамаганьняў і прашкаджаць Японіі у даходжэньні яе імпэрыялістычных мэт».

ЛОНДОН. **Ніжняя Палата.** Бальфур на пытаньне заявіў, што ў гэты момэнт ён нічога ня можэ сказаць аб палажэньні ў Азіяцкай Расеі, але што англіцкі урад з найвялікшай увагай сочыць за ім.

ТОКІО. Японскі ультіматум будзе пададзен не Расеі, а толькі ураду большэвікоў. У ультіматуме будзе сказано, што ўсе ўчыненые большэвікамі крокі, а ў тым і падпісаньне міра, — варожые да саюзнікаў. Невядома, чы Японія зробіць сваю заяву і ад імі Кітаю, чы кітайскі урад звернецца да Расеі з асобнай нотай.

ВАШЫНГТОН (Рэўтэр). Злучэные Штаты прынцыпіальна згодзіліся з Японіей, Англіей і іншымі саюзьнікамі аб опэрацыях у Сібіры. Падробнасьці яшчэ не апрацованы.

Мірные перэгаворы з Румыніей.

БУКАРЭШТ. Румынскі урад загадаў свайму быўшаму паслу ў Лёндоне, Мішу, весьці мірные перэгаворы.

БУДАПЭШТ. Офіцыоз вэнгерскаго ураду „Pester Lloyd“ пішэ аб мірных перэгаворах з Румыніей:

„Грамадзянство жадае забаспечэньня румынскай граніцы ад будучых румынскіх напасьцей з-за кута“.

ВЕНА. Як даведалася «N. F. Presse», цэнтральные дзержавы дамагаюцца, каб Румынія вярнула Боўгары ўсю Добруджу.

СОФІЯ. **Собраніе.** Міністэр-прэзыдэнт Радославов кажэ аб варунках цэнтральных дзержаў, пададзеных Румыніі. Яны складаюцца: з уступкі Добруджы боўгарам, папраўкі румынска-вэнгерскай граніцы і экономічных льгот для цэнтральных дзержаў.

БЭРЛІН (В Т.Б.). У замку Бухтэа 5 марца а 7 гадз. паабедзі прэдстаўнікі цэнтральных дзержаў і Румыніі падпісалі умову, ў каторай, між іншым, гаворыцца:

1. Румынія уступае цэнтральным дзержавам Добруджу да Дунаю.

2. Цэнтральные дзержавы даюць Румыніі торговую дарогу праз Констанцу да Чорнага мора.

3. Румынія прынцыпіальна прыстае на жаданьне Аўстрыі аб папраўцы граніцы між Аўстро-Вэнгрыей і Румыніей.

5. Румынскі ўрад дэмобілізуе ўраз-жэ прынямсі 8 дывізій.

7. Румунскі ўрад абязываецца памагаць усемі сіламі пры перавозцы войск цэнтральных дзержаў праз Молдавію і Бэссарабію у Одэссу.

9. Гэта умова мае сілу ўраз жэ.

З усяго сьвету.

РОТТЭРДАМ (Рэўтэр). Лёрд Лендсдоўн у абшырным пісьме да «Daily Telegr» між іншым пішэ: «Апошняя прамова Гэртлінга — гэта значны крок упярод у абмене думкамі аб міры». Лендсдоўн задаволен прыняцьцем нямецкім канцлерам чатырох аснаўных пунктаў Вільсона. Абмен думак можэ абярнуцца ў неофіцыальную нараду. Аднак, труднасць дайсьці угоды можэ узрасьці, калі англічане будуць гаварыць аб Эльзас-Лётарынгіі, аб італьянскіх дамаганьнях ад Аўстрыі і аб англіцкіх апэтытах на часьці Турэччыны.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньня:

3.III. Заходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскага і нямецкага Насьледніка: Жывая разведачная чыннасць у чысьленых пунктах фронту. На поўначы ад Рэймсу і на ўсходнім беразі Маасу жывейшая чыннасць француcкай артылеры.

Фронт Альбрэхта Вюртэмбэрскага: На усходнім беразі Маасу—вострая артылерыйская бітва. Сільные францускіе дружыны наступалі ў вечары на нашы пазыціі на поўначы ад Нэньі. Контратакай яны адкінуты.

На Лётарынгскім фронці і ў сярэдніх Вогезах баевая чыннасць крапчэла.

Усходні тэатр:

Румыны прысталі на нашы варункі. Гэтак замірэньне з Румыніей ізноў мае сілу.

Аустрыяцкіе апавешчэньня.

ВЕНА. 4.III. У Падольлі опэрацыі ўдачна развіваюцца. Дагэтуль узяты 770 гармат, больш за 1.100 кулемётаў і вялізарные запасы ваенных матэр'ялаў.

6.III. Усходні тэатр:

Фронт Рупрэхта Баварскага: Ворагі востра абстрэлівалі нашы пазыціі на паўночным беразі Ліс. Сільнае англіцкае наступленьне пры Вастэн адкінуто штыкамі. Набапал Скарп і пры С.-Кантэн крапчэла баевая чыннасць.

Фронт нямецкага Насьледніка: На паадзінокіх адрэзках—артылерыйскіе бітвы. Пры Орн нашы дружыны ўзялі 28 палонных.

Фронт Альбрэхта Вюртэмбэрскага: На канале Рэйн-Марн, у даліне Тан і пры Альткірхэн—жывейшая чыннасць французаў.

Усход.

Згодне с просьбай фінляндзкага ураду нямецкіе войскі высадзіліся на Аляндзкіх астравох.

С пачаткам новага замірэньня з Румыніей пачаліся і перэгаворы аб міры.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

ЛОНДОН. Параход «Kalgarin», 17.000 тонн, збудаваны ў 1914 г., затоплен пры Ірляндзкім узбярэжжы. На параходзі было 550 асоб.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Навакол Англіі нямецкіе падводные лодкі ізноў затапілі 20.000 тонн.

БЕРЛІН (В Т Б.). Нямецкіе лодкі ў канале Ляманш і ля усходняга узбярэжжа Англіі затапілі 22.000 тонн.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Новые ўдачы падводных лодак у паўночных водах 16.500 тонн.

Друкавана у друкарні Ж. Кухты. Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.